ТЭЛЕПРАГРАМА НА ТЫДЗЕНЬ

№№243-244 (1806-1807)

Субота, 20 снежня 2003 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень
Выдавец:
УП «Народная воля».

Кошт свабодны.

Народная Воля

E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — -1...+1, уначы — 0...+2; у Брэсце ўдзень — -1...+1, уначы — +1...+3; у Гродне ўдзень — -1...+1, уначы — 0...+2; у Віцебску ўдзень — 0...+2, уначы — 0...+2; у Гомелі ўдзень — -1...+1, уначы — -1...+1; у Магілёве ўдзень — -1...+1, уначы — -1...+1.

На працягу сутак па ўсёй краіне — без ападкаў.

www.meteo.by

ПУЛЬС

Сямідзённыя калядныя канікулы

Дні з 1 па 7 студзеня 2004 года ў Беларусі абвешчаны непрацоўнымі. Як паведамляе прэс-служба прэзідэнта Беларусі, згоду на адпаведны перанос працоўных дзён у будучым годзе (у якасці эксперыменту) даў Аляксандр Лукашэнка.

Прынята рашэнне перанесці працоўныя дні з пятніцы 2 студзеня — на суботу 10 студзеня, з панядзелка 5 студзеня — на суботу 17 студзеня, з аўторка 6 студзеня — на суботу 31 студзеня. Такім чынам, жыхарам краіны прадастаўляюцца сямідзённыя калядныя канікулы, зазначаюць у прэс-службе.

Падоўжаны тэрмін падачы заяў на атрыманне выплат

Тэрмін падачы заяў на атрыманне выплат грамадзянам, якія прыцягваліся падчас Другой сусветнай вайны да рабскай і прымусовай працы на тэрыторыі Аўстрыі, падоўжаны да 31 снежня. Такое рашэнне прынята 17 снежня ў Вене, дзе пад старшынствам федэральнага канцлера Аўстрыі Вольфганга Шусэля адбылося 8-е пасяджэнне апякунскага савета Аўстрыйскага фонду прымірэння.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе МЗС Беларусі, у пасяджэнні ўзялі ўдзел дэлегацыі шасці партнёрскіх арганізацый — Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Венгрыі.

Па стане на 1 снежня, 2908 беларусаў атрымалі выплаты, агульны памер якіх склаў 6 мільёнаў 188 тысяч 92 еўра 90 цэнтаў.

Андрэй СЕРАДА.

Сем званоў ад прэзідэнта Украіны

Сем званоў вагой ад 7 да 350 кілаграмаў дастаўлены ў брэсцкі гарнізонны Свята-Нікольскі храм, размешчаны на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой".

Як паведаміў генеральны консул Украіны ў Брэсце Міхаіл Калядзін, падчас візіту ў Беларусь Леаніда Кучмы ён паабяцаў падарыць храму, які адраджаецца, званы. Яны былі выраблены на Нова-Валынскай фабрыцы званоў. На самым вялікім звоне ёсць надпіс "У памяць абаронцаў Айчыны. Прэзідэнт Украіны Леанід Кучма".

Свята-Нікольскі гарнізонны храм мае цікавую гісторыю. Ён быў узведзены як праваслаўная царква ў XIX стагоддзі, калі на месцы старога Брэста вырасла крэпасць. Пры паляках тут быў касцёл, у савецкія гады — гарнізонны клуб. На пачатку 1990-х гадоў паўразбураны храм, які быў адным з элементаў мемарыяльнага комплексу, перадалі праваслаўным. Настаяцель храма Ігар Умец нямала зрабіў для яго аднаўлення.

БелаПАН.

Анатолю Міхайлаву прысуджаны медаль Гётэ

Вышэйшая ўзнагарода Інстытута імя Гётэ (ФРГ) упершыню прысуджана лаўрэату з Беларусі — прафесару Анатолю Міхайлаву, рэктару Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта ў Мінску.

"Прызнаны даследчык Хайдэгера, член Еўрапейскай акадэміі навук і мастацтваў, прафесар Міхайлаў з'яўляецца вучоным міжнароднага значэння", — зазначаюць у Пасольстве Германіі ў Беларусі. Кіруемы ім ЕГУ "вядомы далёка за межамі Беларусі як сучасная і эфектыўная ўстанова адукацыі, якая падтрымлівае таксама шматбаковыя сувязі з вышэйшымі навучальнымі і навуковымі ўстановамі ў Германіі".

Штогод Інстытут уручае медаль Гётэ — афіцыйную ўзнагароду Германіі. Гэтым медалём узнагароджваюцца замежныя грамадзяне, якія маюць выдатныя заслугі ў галіне распаўсюджвання нямецкай мовы і ў сферы міжнароднага культурнага абмену. З моманту першага прысуджэння ўзнагароды ў 1955 годзе яе быў удастоены 291 грамадзянін з 52 краін.

Заснаваны ў 1951 годзе Інстытут імя Гётэ з'яўляецца найбуйнейшай арганізацыяй у сферы германскай культурнай палітыкі за мяжой. Ён мае 141 філіял у 77 краінах.

Вольга ЛАПІКАВА.

Аналіз «небяспечных» артыкулаў законапраекта аб СМІ

Цэнтр прававой абароны грамадскага аб'яднання "Беларуская асацыяцыя журналістаў" падрыхтаваў зборнік матэрыялаў, прысвечаных абмеркаванню праекта "Закона аб СМІ", дзе змяшчаецца аналіз "небяспечных артыкулаў". Аб гэтым паведаміў кіраўнік цэнтра Міхаіл Пастухоў на прэс-канферэнцыі ў офісе БАЖ.


М.Пастухоў паведаміў: "Мы падрыхтавалі на 22 старонках заўвагі і прапановы паводле гэтага законапраекта. Гэтыя заўвагі мы разашлём усім рэдакцыям, адказным чыноўнікам Міністэрства інфармацыі, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, дыпламатам, кіраўніцтву офіса АБСЕ". У зборніку прыведзена ацэнка праекта такімі замежнымі арганізацыямі, як "Артыкул 19" і іншыя.

Закон аб сродках масавай інфармацыі, лічыць кіраўнік Цэнтра прававой абароны Міхаіл Пастухоў, будзе прыняты ўжо ўвесну. У гэтым М.Пастухоў бачыць вялікую небяспеку: "На працягу года пасля прыняцця закона прадугледжана масавая перарэгістрацыя СМІ. У выніку ўвосень незалежныя СМІ будуць думаць не пра асвятленне перадвыбарнай парламенцкай барацьбы, а пра сваю перарэгістрацыю".

Максім ЗМІТРОВІЧ.

У Мінску — эпідэмія грыпу

19 снежня ў Мінску афіцыйна абвешчана пра эпідэмію грыпу.



Як паведаміла БелаПАН загадчыца эпідэмічнага аддзела Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Алена Фісенка, з 8 па 15 снежня ў Мінску было 28 тысяч выпадкаў захворванняў на грып і вострыя рэспіраторна-вірусныя інфекцыі (ВРВІ). Аднак, пачынаючы з 15 снежня, штодня колькасць тых, хто звярнуўся ў лячэбна-прафілактычныя ўстановы горада з дыягназам "грып" дасягнула 7 тысяч чалавек. Такі паказчык, паводле яе слоў, адпавядае эпідэмічнаму росту сярэдняй інтэнсіўнасці: гэта не найвышэйшы ўзровень.

Дзеці да 14 гадоў складаюць 50 працэнтаў, пры гэтым найбольш высокі паказчык захворванняў адзначаны ва ўзроставай групе да 6 гадоў. Штодня шпіталізуецца менш за адзін працэнт з агульнай колькасці захварэлых. Сітуацыя па школах дастаткова стабільная, перадумоў для іх закрыцця на каранцін няма. Спецыяліст зазначыла, што школа зачыняецца на каранцін у тым выпадку, калі колькасць захварэлых вучняў перавышае 30 працэнтаў.

Грып у асноўным канцэнтруецца ў Фрунзенскім і Цэнтральным раёнах сталіцы, бо ў гэтых раёнах традыцыйна пражывае насельніцтва з груп рызыкі — дзеці і пажылыя людзі.

З прычыны абвешчанай эпідэміі, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Мінска Фёдар Германовіч падпісаў пастанову, у якой акрэслены асноўныя супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы ў амбулаторна-паліклінічных установах, у стацыянарах, дзіцячых і падлеткавых установах, на прамысловых прадпрыемствах, а таксама на прадпрыемствах грамадскага харчавання, гандлю, камунальнай гаспадаркі. Хворыя на грып і ВРВІ будуць абслугоўвацца па месцы пражывання, для гэтых мэтаў прыцягваюцца дадатковыя медыцынскія кадры.

Алена Фісенка зазначыла, што ў сувязі з абвяшчэннем эпідэміі навагоднія мерапрыемствы для дзяцей адмяняцца не будуць, бо ўдзел у іх бяруць, як правіла, здаровыя дзеці. Таму спецыяліст парэкамендавала бацькам больш уважліва ставіцца да здароўя дзяцей.

На сённяшні дзень, сказала А.Фісенка, у горадзе цалкам зрасходавана вакцына, закупленая за кошт сродкаў дзяржавы (больш за 80 тысяч доз). У камерцыйных клініках, паводле яе слоў, можна зрабіць прышчэпку супраць грыпу пры дапамозе сучаснай вакцыны, што дазваляе выпрацаваць імунітэт за 8—12 дзён нават на пачатку эпідэмічнага росту захворвання. Акрамя таго, неабходна праводзіць экстранныя хімія-прафілактычныя мерапрыемствы пры дапамозе такіх прэпаратаў, як рэмантадын, аксалінавая мазь і супрацьгрыпозныя комплексы.

Нагадаем, што папярэдняя эпідэмія грыпу была абвешчана ў Мінску 6 сакавіка і афіцыйна завяршылася 3 красавіка. За гэты час на грып і іншыя ВРВІ перахварэлі каля васьмі працэнтаў насельніцтва горада (каля 140 тысяч чалавек). Пры гэтым каля 47 працэнтаў ад агульнай колькасці захварэлых склалі дзеці да 14 гадоў. Інтэнсіўнасць эпідэмічнага пад'ёму, зазначыла спецыяліст, у гэты час была слабая.

Вольга АСІПЕНКА.

Путин против третьего срока



В ходе Всероссийской пресс-конференции Владимиру Путину были заданы вопросы и о третьем сроке президентства. Вот что он ответил на них:

— Как Вы относитесь к увеличению срока президентских полномочий и возможности третьего президентского срока?

— Я отношусь к этому отрицательно.

— Неужели Вы собираетесь оставить пост президента через четыре года?

— Нужно еще дожить до марта, и только после этого можно говорить о следующих выборах. Но могу сказать: я против, чтобы кто бы то ни был и какими бы соображениями благими он ни руководствовался нарушал Конституцию нашей страны.

АНОНС

Письма из Америки

Вы никогда не думали, почему американцы так активно грабят и растаскивают по своим домам национальное богатство Беларуси — наших красивых женщин? Почему подобных объявлений с ключевыми словами "хочу жениться" не сыскать, во всяком случае в таком большом количестве, в Швеции, Бельгии, Германии?

Однозначно ответить непросто, но и усложнять проблему не следует. Любая женщина из развитой европейской страны такое предложение воспримет как личное оскорбление, исходя из здравого смысла, что она и сама найдет себе достойного мужчину. Европейская женщина на бедствует, за коммунальные услуги платит много, но того, что остается, ей с избытком хватает на жизнь, наряды, отдых в Египте и хорошую косметику. В конце концов, она знает себе цену.

Всякий раз я с грустью читаю в калифорнийских русскоязычных газетах объявления, где ключевыми словами всегда являются просьба и предложение одновременно: "Молодая красивая белоруска ищет любую работу. Брак не исключен. В дорогу ее гонит безысходность, тупики и ловушки повседневной жизни, а еще — большая и наивная вера в сытную жизнь за океаном. Это правда, меда там действительно много. И по губам он течет. Да не каждому в рот попадает...

Леонид АНОП,
собственный корреспондент "Народной воли" в США.

("Народная воля" публикует сегодня очередной аналитический очерк нашего корреспондента в Америке. Читайте 3-ю страницу газеты.)

Ф. РД-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ______ (індэкс выдання)

Народная Воля

Колькасць камплектаў ______

на 2004 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету ______ (індэкс выдання)

ПВ	месца	літар

Народная Воля

Кошт	падпіскі ___ руб.	Колькасць камплектаў
	пераадрасоўкі ___ руб.	

на 2004 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозвішча, ініцыялы)

Лепшы навагодні падарунак — «Народная воля»!

Вы па-ранейшаму думаеце, што падарыць на Новы год сваім блізкім, сябрам, саслужыўцам?
Напамінаем: лепшы падарунак — падпіска на "Народную волю".
Разумееце: кожны дзень чалавек будзе чытаць захапляльныя матэрыялы і ўспамінаць Вас.
А ў рэдакцыі на 2004 год шмат новых праектаў, цікавых задум.
Для нас няма забароненых тэм. Для нас галоўнае — праўда!
Наша сіла — у Вашай падтрымцы. Будзем разам і ў 2004 годзе.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

Сёння — субота. У Вас ёсць час, каб забегчы на пошту ці ў любы падпісны пункт "Белсаюздруку", "Росчырка" і аформіць падпіску на "Народную волю" на першую палову 2004 года.

СПОРТ-ЭКСПРЭС

Біятлон

Адзін беларус не дайшоў да фінішу

На чарговым этапе Кубка свету, які зараз праходзіць у Славакіі, не зусім удала выступілі беларускія біятланісты.

У жаночай індывідуальнай гонцы на 15 кіламетраў наша Алена Зубрылава, зрабіўшы на чатырох агнявых рубяжах толькі адзін промах, заняла 4-е месца. Ксенія Зікункова на 25-м месцы, Кацярына Іванова — на 27-м, Вольга Назарава — на 28-м.

У мужчынскай індывідуальнай гонцы на 20 км лепшы вынік сярод беларускіх спартсменаў у Уладзіміра Драчова — 11-ы радок. У Алега Рыжанкова — 15-ы, Аляксея Айдарава — 30-ы, Аляксандра Сымана — 51-ы, Яўгена Сцяпанава — 86-ы, а наш Сяргей Новікаў нагул не дайшоў да фінішу.

Хакей

Старэйшыя бяруць прыклад з малодшых

У польскім мястэчку Крыніца праходзіць чарговы этап "Еўрапейскага хакейнага выкліку", дзе сапернікамі нашай нацыянальнай зборнай сталі на гэты раз каманды Польшчы, Францыі і Нарвегіі.

У першым матчы беларускія хакеісты сустракаліся з французамі і перамаглі — 3:1 (1:0, 1:0, 1:1).

Дзве шайбы ў нашай камандзе закінуў Андрэй Скабелка (3-я хвіліна і 29-я), а за 4 секунды да заканчэння матча адзначыўся ў зборнай і Сяргей Задзялёнаў.

Расіяне гулялі так, як быццам перад матчам напіліся піва

У Маскве стартаваў чарговы Кубак півараванай кампаніі "Балтыка".

Шчыра кажучы, расчаравала расійская зборная, якая пад кіраўніцтвам легендарнага Віктара Ціханава прайграла ў першым матчы фінам — 1:3. Чэхі ў гэты ж дзень таксама саступілі камандзе Швецыі — 2:3.

Падборку падрыхтаваў Алесь СІВЫ.

Семен БУКЧИН

Старый-новый облик коллаборантов,

или

Под чем предлагают подвести «жирную черту» «социально близкие»

Спадар Дынько в роли миротворца

Газета "Наша Ніва" уже не первый год озабочена прокладыванием "своих путей" в белорусской общественно-политической жизни. Не впервые слышим мы раздающиеся с ее страниц клики радости по поводу очередного антироссийского демарша со стороны нынешнего режима и обслуживающей его прессы. В официальных выпадах против России, в развязной критике "имперского соседа" в официозной прессе и на телевидении видят деятели "НН" вполне реальный залог строительства суверенного белорусского государства. Тешит сама возможность высказываться не только критично, но и уничижительно-презрительно в адрес недавней "священной коровы" — России. Логика здесь проста: чем дальше от России — тем ближе к независимой Беларуси.

Что это будет за "независимая Беларусь", какие в ней будут царить порядки — это дело десятое. Главное — независимость. Будем независимыми, сохраним свою государственность, а там, даст Бог, и остальное, с той же демократией, к примеру, как-нибудь устроится. Поэтому чем хуже в России — тем лучше для Беларуси. Погибли люди в истории с "Норд-Остом" — замечательно! Бухают взрывы в разных местах России — великолепно! Явно пропрезидентская Дума образовалась на последних выборах — отлично! Белорусская власть нынешняя должна, наконец, понять, что у нее остался единственный коридор — национальный, к которому и подталкивают ее услужливо мыслители из "НН". Ну должен, наконец, Лукашенко понять, в чем его истинная выгода и, безусловно, спасение!

Результаты выборов в Думу вызвали особенное вдохновение в стане деятелей "НН". Главный редактор газеты Андрей Дынько восторженно пишет в номере за 12 декабря: *"Власти эволюционировали. Павел Якубович рассуждает с позиций субъектности Беларуси... Белорусская президентура отреагировала на результаты думских выборов совещанием по вопросам внешней политики. Речь о "диалоге" с США и Евросоюзом и "поэтапном налаживании отношений 8 декабря воспринималась как политический сигнал Западу и предупреждение России"*.

И даже оппозиция в Вильнюсе, совсем уж заходится в восторге А. Дынько, *"просила, чтобы литовцы помогли улучшить имидж Беларуси в Европе"*.

Эту радость главного редактора "НН" несколько снижает им же осознаваемое, что *"улучшение отношений с Западом может остаться движением без ответа, пока не достигнут внутринациональный консенсус в принципиальных политических, экономических и национальных вопросах, пока власти и оппозиция не начнут играть в одном стиле и на одном поле"*. Минимальными предпосылками, при которых *"лукашенковцы и оппозиция заговорят на одном языке"*, редактору Дынько видятся две вещи: *"жирная черта под прошлым, под 90-ми годами, и отказ от насилия как способа достижения политических целей"*.

Предлагая этот компромисс, А. Дынько одновременно кокетничает, со вздохом называя свои предложения *"идеалистическими фантазиями среднеевропейского интеллигента"*.

Но тут другое, спадар Дынько, тут другое... Совсем далекое от фантазий даже *среднеевропейского интеллигента,* каковым вы себя скромно именуете. Тут запахло другим, давним и хорошо знакомым...

Но будем соблюдать порядок.

Эволюция как бег на месте

Прежде всего хочется посоветовать редактору "НН" умерить бурную радость по поводу якобы эволюции власти белорусской в связи с выборами в Думу. Никакой эволюции нет. Есть очередная пустопорожняя декларация о "многовекторности белорусской внешней политики", о необходимости "улучшения отношений с Западом" и прочем. Эту демагогическую эквилибристику слышим мы уже не первый год. Никого она, кроме обладающего сверхчутким слухом редактора "НН", не интересует.

Что касается Запада, то для него Беларусь как фактор политический вообще не существует. Не говоря о факторах военном и экономическом. Поэтому не надо делать вид, что когда Лукашенко заявляет о необходимости "многовекторности внешней политики" и "поворота на Запад", то на второй день президент США Буш устраивает срочные консультации по этому поводу с Кондолизой Райс и Колином Пауэллом, а президент Франции Жак Ширак звонит канцлеру ФРГ Шредеру, чтобы выработать совместную позицию в связи с таким неожиданным заявлением белорусского правителя. И в России никто не почесался даже по поводу того же заявления. Эти сотрясения воздуха никого уже давно не интересуют. Все видят и знают: нет никаких реальных изменений в Беларуси, право, суды, экономика, пресса, парламент — все здесь по-прежнему под пятой одного человека и верной ему вертикали. И Россию, кстати, спадар Дынько, такой порядок у нас очень устраивает.

Что же до белорусской критики в адрес России, то там к этому затянувшемуся спектаклю давно привыкли. Мало ли в России есть губернаторов, позволяющих себе неуважительные выкрики в адрес Кремля! Ну еще один губернатор, на этот раз белорусский, пускай поупражняется! Подемонстрирует свою якобы свободу! От России не убудет, а самолюбие свое человек потешит... Главное — это то, что российский контроль над этой территорией сохраняется стопроцентный. Это усвоил даже Жириновский, который когда-то позволял себе неуважительные высказывания в адрес некоего "конюха". А редактор "НН" все еще двигает в азарте фишки: "Они нас так, а мы их вот этак!" Фишки уже давно в одном кармане, спадар Дынько, и выдают их для игры под строгим контролем.

И, наконец, отчего такие восторги по поводу статьи в "Советской Белоруссии", которую "НН" перепечатала с сокращениями? Что такого в ней "эволюционного"? Может быть, это? *"Сформировав Думу таким образом, каким она сегодня является перед всем миром — консолидированной, идейно однородной и сплоченной вокруг президента, — Владимир Путин будет нести персональную ответственность за все, что произойдет в России"*. Но эту мысль уже растиражировали десятки российских комментаторов. Как и сожаление по поводу отсутствия в Думе Явлинского. Критицизм по отношению к ушедшей Думе тоже достаточно традиционен. И в который раз думаешь: вот бы автор свое, продемонстрированное на России умение разбираться в борьбе *"разных кланов, прежде всего связанных с силовиками"*, показал на белорусском примере... Неужто у нас нет своих кланов и связанных с ними силовиков? Обидно...

Впрочем, золотое слово главного редактора "СБ", как нам кажется, в последнее время с особенным вниманием воспринимается в редакции "НН". Тем более что молодежь там оказалась "социально близкая".

Надеюсь, вы помните, читатель, из каких времен к нам пришло это выражение. Были враги у советской власти, но даже среди них, прежде всего в сталинских лагерях, начальство разделяло "настоящих врагов народа" и "элементов социально близких". А история, как известно, повторяется...

"Мы ваши, ваши до последней косточки!" — кричат деятели из "НН" тем, кого они называют "лукашенковцами". А те как будто оглохли, не слышат. Но у "нашанивцев" уже кончается терпение. И тогда они начинают открыто, можно сказать, на пальцах объяснять всё власти, как это делает в том же номере газеты Борис Тумар: *"В России постепенно исчезает не только надежда на демократическое чередование властей, но и понятие демократической конкуренции"*. И вот какой вывод делается из этого наблюдения: *"На укрепление и централизацию путинской власти в России лукашенковцы должны отреагировать дальнейшим сворачиванием отношений с Москвой"*.

(Окончание на 2-й стр.)

ЗА ЧАШЕЧКОЙ КОФЕ С МАРИНОЙ КОКТЫШ

Анатолий ПАВЛОВ:

«Единая государственная идеология — первый признак тоталитарного режима»

Почему уехал в Канаду бывший муж Алены Свиридовой?

Как воспринимаются студентами лекции по "Основам идеологии белорусского государства"?

Каковы истинные причины отставки экс-ректора БГУ Александра Козулина?

Об этом и многом другом я беседую с проректором Белорусского государственного университета в 1995—1997 годах ***Анатолием Павловым.***



— Анатолий Васильевич, знаю, Вы были в хороших отношениях с бывшим ректором БГУ Александром Козулиным. У Вас есть версии, почему его все-таки сняли с должности?

— Сложный вопрос... Полагаю только, что Козулина сняли не просто так. И вся эта история с золотом и "бегством" ректора за рубеж тоже громогласно была озвучена по телевидению неспроста...

— В одном из своих выступлений Лукашенко сказал, что его надежды на БГУ не оправдались: там был самый низкий процент проголосовавших за него. Вы разделяете версию, что это послужило одной из причин отставки Козулина?

— Вполне может быть...

— Выходит, в других вузах надежды "вождя" оправдывались?

— Насколько я знаю, почти во всех столичных вузах студенты голосовали против Лукашенко.

— Недавно на встрече со студентами одного столичного вуза министр образования Александр Радьков заявил, что в ближайшем будущем высшее образование можно будет получить за четыре года. Вы наверняка знаете, как отреагировали на это в педагогической среде?

— Пока все молчат. Но лично я отношусь к этому резко отрицательно. Пять лет учатся в университетах не только у нас, но и за рубежом. Три года, как правило, начитывают общеподготовительный цикл, после начинается специализация, преддипломная и дипломная практика. Перейти на четыре года — значит что-то выбросить. Что? Дипломную практику? Тогда каких специалистов мы выпустим?

— Видимо, в 12-м классе будут преподавать те предметы, которые сегодня читают на первом курсе вуза.

— А кто их будет читать и какие именно предметы сегодня чиновники готовы перенести из университета в школу? Какие при этом дополнительные средства будут вложены в средние школы?

Не все так просто... И прежде чем делать подобные заявления, министр должен все хорошо обдумать и взвесить, спросить мнение учителей, родителей. Чтобы не получилось, как с 10-балльной системой: до сих пор разрабатывают критерии, за что же ставить 10 баллов? А на вступительных экзаменах дают команду десятку не ставить — это всем известно. Тогда, спрашивается, зачем вообще вводили эту систему? Когда была 5-балльная система, на вступительных экзаменах пятерки ставить не запрещали...

— А как Вы смотрите на то, что совсем недавно отменили льготы для медалистов при поступлении в вузы?

— В последнее время ценность медали девальвировалась. Например, в 1966 году в выпускных классах было один-два медалиста. А в середине девяностых, когда мой сын заканчивал школу, в некоторых классах было аж одиннадцать! Я не хочу сказать, что сейчас медали менее заслуженные. На мой взгляд, систему критериев медалистов просто нужно сделать более жесткой. И обязательно сохранить льготы для отличников при поступлении как поощрение. Иначе ученикам не к чему стремиться, у них нет стимула к труду.

В мои времена в школе лидерами были те, кто был лучшим в учебе. А сегодня в школах, как правило, преобладает серость. Над теми, кто хочет учиться, издеваются, их называют выскочками. Поэтому многие родители стараются отдавать своих детей в гимназию, лицей — там созданы все условия для нормальной учебы. То же самое, по сути, относится и к выпускникам вузов. Как правило, талантливые люди в нашей стране не задерживаются. Аспиранты ищут какие-то международные программы и уезжают туда, где их мозги более востребованы. Здесь нет никаких перспектив...

— Значит, образование, полученное за рубежом, по-прежнему считается более престижным?

— Уровень подготовки наших выпускников по химии, физике, биологии, математике не хуже, а зачастую и лучше зарубежного. Другое дело, что мы совершенно не интегрированы в международное образовательное сообщество. В Европе, например, студент запросто может поехать в другую страну и прослушать необходимый ему курс лекций, которого нет в его вузе. Белорусский студент, ясное дело, так поступить не может.

Вопрос не в том, что наши специалисты хуже. Просто наши дипломы за рубежом не признают. Но с подтверждением диплома у белорусов, насколько я знаю, проблем не возникает. В Канаде, в Америке столько моих однокурсников работает!..

— А Вы почему не уехали?

— Потому что уже старый. Если бы мне сейчас было 30, меня бы здесь уже не было. А после 45-и в той же Канаде ты никому не нужен. Я пытался уехать в Страну кленового листа, но в последний момент передумал: сын заканчивал юрфак, и со своим образованием в Канаде он стопроцентно был бы безработным. Если бы он учился в школе, я бы уехал не раздумывая. И не потому, что я не патриот своей страны. Я люблю Беларусь. Но когда тебя здесь каждый день унижают, обдирают как липку, не дают зарабатывать, невольно думаешь об эмиграции.

Интересная деталь: в 1996 году более 80 процентов из пяти тысяч студентов БГУ на вопрос: ***"Хотите ли Вы уехать из Беларуси?"*** ответили отрицательно. Сегодня, судя по многочисленным социологическим опросам, уехать хотят практически все. И процесс утечки мозгов из Беларуси какими-то окриками и идеологическими лозунгами не остановишь.

У нас на химфаке работал первый муж Алены Свиридовой. После того как их брак распался, он уехал в Канаду. Сейчас белорусский химик живет там припеваючи.

А те, кто остался, молча тянут свою лямку. Я даже по однокурсникам своим сужу: они работают, читают лекции, но глаза у них при этом не горят, как раньше. Отчитал и ушел. Если раньше у преподавателя по непонятной причине срывалось занятие — это было чрезвычайное происшествие! А сегодня не прийти или опоздать на лекцию для некоторых преподавателей — в порядке вещей.

— Особенно если это лекция по идеологии. Вы хорошо знаете многих из тех, кто сегодня ее "двигает" в массы. Никогда не интересовались, с каким настроением Ваши знакомые читают лекции по "основам белорусской идеологии"?

— Многие просто отбывают номер, читают спустя рукава. Отводя глаза. Преподаватели ведь лучше других знают, что происходит в стране, они видят абсурдность проводимого нынче курса и если пока не готовы к открытому протесту, то готовы к закрытому. Например, в мою бытность студентом на лекциях по истории КПСС наша преподавательница говорила с нами про хоккей, читала нам хорошую художественную литературу. Так, видимо, будет и сейчас.

Единая государственная идеология — это первый признак тоталитарного режима. Государственной идеологии а-приори не может быть. Об этом, кстати, на одной из встреч со студентами сказал и Путин.

Конечно, найдутся неравнодушные студенты из числа "свядомых", которые будут до хрипоты спорить на этих занятиях с преподавателями-ретроградами. Университет — это особая атмосфера. Это центр свободного мышления, вольной мысли. Но система никого не пощадит... Будет много поломанных судеб...

— А может, не все так трагично? Мне кажется, сегодняшних студентов сложно испортить, покалечить идеологией: они уже почувствовали вкус свободы и на мир смотрят совершенно по-другому.

— Безусловно, чем сильнее студент, тем больше у него выражено собственное Я. Но дело в том, что студенты волей-неволей вынуждены будут отвечать на вопросы на некоторых экзаменах и зачетах, не веря в то, что они говорят. А это как называется? Лицемерие. И что же мы тогда растим за общество?..

— Лукашенко на одном из больших совещаний заявил: *"Недопустимо, когда чиновники или преподаватели учебных заведений не разделяют государственной идеологии, а иногда открыто выступают противниками власти и того курса, который они сами должны проводить, будучи вмонтированными в эту систему. Не согласны с государственной политикой — пишите заявления, мы еще этот уход профинансируем, нам это будет дешевле".* **Кто-нибудь ушел?**

— Об уходах я не слышал. Лукашенко слишком легко распоряжается людскими судьбами. Кто ему дает право заявлять подобное? Ведь он — гарант Конституции, а Конституция гарантирует свободу взглядов, свободу выбора профессии и право на труд.

— Известно, что сегодня политинформации проводятся даже на фермах. Любопытно, как народ воспринимает подобные мероприятия?

— Ну какую идеологию можно проводить сегодня в этой несчастной деревне, если там зарплату платят невовремя, да и та в некоторых колхозах — десять-двадцать тысяч рублей? Ну уволят колхозника, так сказать, по идеологическим соображениям, а работать кто будет?..

Когда заговорили об идеологии, я открыл большой энциклопедический словарь. Там написано: *"Идеология —это система политических, правовых, нравственных, религиозных, эстетических и философских взглядов и идей, в которых осознаются и оцениваются отношения людей к действительности. Нередко термин "идеология" употребляется также для обозначения ложного, иллюзорного, оторванного от действительности сознания".*

А какая у нас идеология?.. Никто сегодня толком не может ответить на этот вопрос. Я не знаю, какая идеология у американцев, но почти каждый из них перед своим домом поднимает звездно-полосатый флаг. Потому что знает: где и что бы с ним ни случилось, Америка всегда станет на его защиту. И американский суд будет судить его по закону, а не по чьему-то звонку сверху.

Патриотизм воспитывается не бумажками с лозунгами и не речевками БРСМовцев. В свое время в партию ведь тоже записывались в основном не потому, что коммунистическую идеологию шибко любили, а потому, что без партии не было профессионального роста. Так сейчас и в тот же БРСМ принимают.

— А насколько сегодня сильна эта структура? Действительно ли председателя Белорусского республиканского союза молодежи Михаила Орду можно назвать молодежным лидером?

— О чем вы говорите!.. Это самые настоящие приспособленцы! Если бы эта структура была сильна, если за БРСМ действительно пошли бы сотни тысяч молодых людей, эта структура самостоятельно зарабатывала бы деньги, а не сидела на шее у государства! Не секрет, что БРСМ — это иждивенческая организация, не имеющая мало-мальски серьезного влияния. Почему у нас не финансируются из бюджета неугодные политические партии или общественные структуры, например, тот же Совет ветеранов? Ведь бюджет — это не чей-то личный карман. Бюджет состоит из наших с вами денег. А БРСМовцы за наш счет предоставляют скидки на дискотеки для той молодежи, которая состоит в рядах этой организации. Кто дал им такое право?!

— Право не дают, а скорее отбирают. В мае этого года коллегиальный орган управления БГУ (объединенный совет) лишился права избирать ректора и принимать решение о внесении предложений главе государства о его освобождении. В других странах судьбу ректора тоже решает президент?

— Ректоров назначают только в Беларуси. Во всех других цивилизованных странах эта должность, как и должность президента Академии наук, выборная.

— Анатолий Васильевич, а как Вам новый ректор БГУ?

— Я познакомился со Стражевым в 1994 году. Мы вместе с ним работали в группе поддержки Кебича. Я на месте Стражева не согласился бы возглавить БГУ, особенно если учесть, что это назначение заранее с ним никто не согласовывал. Наверху, видимо, знали, что он согласится, поэтому и не сочли нужным поставить его в известность. О том, что он ректор, Стражев узнал, вернувшись из Германии.

— Стражев, когда его сняли с должности министра образования, признался, что в эмоциональном плане ему было непросто... В свое время Вам, видимо, тоже непросто было принять решение об уходе с должности проректора...

— С должности проректора я ушел без скандала. Александр Козулин создавал свою команду. А я никогда не скрывал собственных взглядов, например, на те же процессы интеграции Беларуси и России. Несмотря на то, что я человек русскоговорящий, голосовал за то, чтобы государственным языком в нашей стране был белорусский...

В 1996 году студенты массово ходили на демонстрации. Мне за это объявили выговор, потому что я отвечал за учебную и социальную работу. Сюжет об этом показали даже по всем каналам российского телевидения.

Мне приходилось брать объяснительные с Павла Северинца, Алексея Шидловского, хотя я с ними во многом был согласен. Потому что, как и они, тоже выступал и выступаю за независимость Беларуси. Но как проректор был обязан разделять и проводить в жизнь совсем другую "линию партии". На самом деле это очень сложно: думать одно, а говорить другое. Постоянно испытываешь психологическиий стресс. Позже некоторое время я работал в горкоме профсоюза образования. Когда его разогнали, остался без работы.

— А теперь, говорят, занимаетесь бизнесом.

— Отнюдь. Я — председатель правления белорусско-российского фонда "За новую Беларусь". Это общественная организация, по уставу не имеющая права заниматься бизнесом.

— А почему Вы вдруг пошли работать в этот фонд? Не нашли себя в партийной деятельности (если не ошибаюсь, Вы ведь член ОГП)?

— Надо было на что-то жить. Когда мне предложили вместо писателя Владимира Некляева возглавить этот фонд, я согласился, потому что сидел без копейки. Но теперь благодарен судьбе, что у меня есть работа, которая позволяет иметь широкий круг знакомств с известными людьми не только в Беларуси, но и в России.

Мне предлагали возглавить колледж имени Сахарова, но мою кандидатуру "зарубили" в Администрации президента. Я весьма неожиданно столкнулся с этими проблемами, хотя никогда не занимался большой политикой... Но, как показывает время, и это — дело наживное.

Досье

Анатолий ПАВЛОВ

Родился в 1949 году.

Закончил химический факультет Белгосуниверситета в 1971 году. Кандидат химических наук.

Женат, имеет сына.

ПУЛЬС

Куплю паўтара квадратных метра!

Тым, хто жадаў, але пакуль не паспеў купіць сабе кватэру, адыходзячы год ніякіх прыемных навін не прынёс.

Як сцвярджаюць спецыялісты, з пачатку года цэны на кватэры значна ўзраслі — аднапакаёўкі падаражалі на 38 працэнтаў, двухпакаёвыя — на 31 працэнт, трохпакаёвыя — на 21, чатырохпакаёўкі ўзняліся ў цане на 16 працэнтаў.

Адзначаецца, што ў апошні час попыт на кватэры перавышае прапановы ў некалькі разоў, а суадносна ўзраслі і цэны — адзін квадратны метр ужо каштуе больш за 500 долараў.

Пры гэтым прагназуецца — яшчэ праз год квадратны метр жылля падаражае яшчэ на 100 долараў ЗША.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Рост ужывання алкаголю дасягнуў рэкорднага ўзроўню

Галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Уладзімір Максімчук паведаміў, што ўжыванне спіртных напояў на душу насельніцтва ў год стала перавышаць узровень 1984 года, калі назіраўся максімальна высокі ўзровень — 8,2 літра на чалавека. На сённяшні дзень гэты паказчык складае больш за 9 літраў абсалютнага алкаголю на чалавека ў год (па рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ён не павінен перавышаць 2 літры чыстага спірту на чалавека ў год).

Паводле слоў спецыяліста, спіртныя напоі ўсё больш сталі ўжываць жанчыны і падлеткі. Асабліва трывожнае становішча з ужываннем спіртных напояў склалася ў сельскай мясцовасці, дзе практычна адсутнічае кантроль за вытворчасцю моцных спіртных напояў у хатніх умовах.

Штогод, сказаў ён, у прыёмныя пакоі бальніц краіны паступае каля 60 тысяч чалавек у стане алкагольнага ап'янення з рознымі захворваннямі, сёлета гэты паказчык склаў 104 тысячы чалавек.

Вольга АСІПЕНКА.

З 1 студзеня за атрыманне аднаразовай эстонскай візы будуць браць 15 еўра

З 1 студзеня 2004 года ў Генеральным консульстве Эстоніі ў Беларусі збор за атрыманне віз будзе збірацца ў еўра. Пра гэта БелаПАН паведамілі ў эстонскім дыппрадстаўніцтве.

Так, за атрыманне аднаразовай візы неабходна будзе заплаціць 15 еўра (раней 17 долараў), шматразовай — 70 еўра (75 долараў).

Як і раней, для атрымання візы неабходна прадаставіць арыгінал запрашэння, пашпарт і медыцынскую страхоўку.

Вольга ЛАПІКАВА.

У дачыненні да службовых асоб беларускіх фірм «Еўраопт» і «Еўрагандаль» узбуджана крымінальная справа

У дачыненні да службовых асоб беларускіх фірм ЗАТ "Еўраопт" і ТАА "Еўрагандаль" узбуджана крымінальная справа.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе Камітэта дзяржаўнага кантролю (КДК), дэпартамент фінансавых расследаванняў КДК падчас вывучэння крымінальнай справы, узбуджанай па частцы 2 артыкула 231 (ухіленне ад выплаты мытных плацяжоў) Крымінальнага кодэкса Беларусі, у дачыненні да ЗТАА "Рабушка" ўзбудзіў яшчэ адну справу.

Справа заведзена ў дачыненні да дырэктара ЗАТ "Еўраопт", камерцыйнага дырэктара і менеджэра ТАА "Еўрагандаль" па прыкметах злачынства, прадугледжанага артыкулам 18 (арганізаваная група) і часткай 2 артыкула 243 (ухіленне ад выплаты падаткаў) КК.

На думку дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК, службовыя асобы "Еўраопту" і "Еўрагандлю" са студзеня 1998 года па жнівень 2002 года аб'ядналіся "ў кіруемую ўстойлівую групу для сумеснай злачыннай дзейнасці". У выніку яны выплацілі работнікам ЗАТ "Еўраопт" і ТАА "Еўрагандаль" заработную плату ў суме 31.900 долараў ЗША, не ўтрымаўшы і не выплаціўшы ў бюджэт падаходны падатак, чым прычынілі ўрон дзяржаве ў асабліва буйным памеры, адзначае прэс-служба КДК.

Генадзь ШАРЫПКІН.

Міжволі стала наводчыкам для злачынцы

Газета Жабінкаўскага райвыканкама "Сельская праўда" міжволі стала "наводчыкам" для злачынцы, які скраў ордэны пенсіянеркі з вёскі Дзяглі.

Некалькі месяцаў таму ў "раёнцы" быў змешчаны артыкул пра жыхарку вёскі Дзяглі 75-гадовую Марыю Ушкар. У матэрыяле расказвалася пра жанчыну з цяжкім лёсам, якая без мужа вырасціла дзвюх дачок, працавала ў калгасе трактарыстам, камбайнёрам. Аб яе працоўных заслугах ведаў асабіста Пётр Машэраў, а дзяржава ўшанавала перадавіка Ордэнам Леніна, Ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, двума ордэнамі "Знак Пашаны" і многімі медалямі.

Праз кароткі час у гэтай жа газеце з'явілася нататка, што ўзнагароды ў жанчыны скрадзены.

Міліцыянеры, якія наведалі жанчыну, высветлілі, што злачынца яе запалохаў. Паводле слоў пацярпелай, аднойчы да яе завітаў малады мужчына з дзіцем. Ён адрэкамендаваўся ўчастковым міліцыянерам і папрасіў паказаць узнагароды. Паводле слоў Марыі Ушкар, яна адразу зразумела, што "прыйшлі па ордэны", бо ўчастковага яна ведала асабіста. Прайшоўшы ў дом, злачынца прывязаў бабулю да ложка, а сам зняў з параднага пінжака чатыры ордэны і забраў 100 тысяч рублёў пенсіі. Потым "пашкадаваў" яе і 50 тысяч пакінуў.

На падставе апісанняў знешнасці злачынцы, была ўстаноўлена яго асоба. Ім аказаўся 20-гадовы брэстаўчанін, які раней быў асуджаны за крадзёж. У Жабінкаўскім раёне, але ў іншай вёсцы, у яго жыве бабуля. Прыехаўшы аднойчы да яе, ён прачытаў мясцовую "раёнку", адкуль і даведаўся пра ўзнагароды жанчыны.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

Выкраў 3 тысячы долараў

Пракуратура Рэспублікі Беларусь накіравала для судовага разбору крымінальную справу па абвінавачанні былога старшыні Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводстве Аляксандра Міхальчанкі.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-цэнтры рэспубліканскай пракуратуры, А.Міхальчанка, скарыстоўваючы свае службовыя паўнамоцтвы, з'яўляючыся аднačасова сустаршынёй грамадскага аб'яднання "Беларускі дабрачынны фонд "Дапамога", заключыў дагавор з Генеалагічным таварыствам штата Юта (ЗША) аб мікрафільмаванні архіўных дакументаў з далейшым пералічэннем заказчыкам валютных сродкаў на рахункі фонду. Паводле яго ўказання, супрацоўнікі камітэта правodзілі працы ў адпаведнасці з дагаворам, а валютныя сродкі паступалі на рахункі фонду "Дапамога". У выніку Дзяржкамітэта па архівах і справаводстве быў нанесены ўрон на агульную суму 62 тысячы 548 долараў ЗША. Частку сродкаў, што паступілі на валютныя рахункі фонду, — 3 тысячы долараў — А.Міхальчанка з выкарыстаннем падробных дакументаў выкраў.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Графік працы замежных дыпламатычных прадстаўніцтваў будзе зменены ў сувязі з калядными і навагоднімі святамі

Графік працы замежных дыпламатычных місій у Беларусі будзе зменены з улікам надыходзячых калядных і навагодніх святаў. Пра гэта БелаПАН паведамілі ў прэс-службах адпаведных пасольстваў і консульскіх устаноў.

Пасольства Вялікабрытаніі будзе закрыта для наведвальнікаў 25, 26, 27 і 28 снежня, а таксама 1, 3, 4 і 7 студзеня. Візавая служба пасольства, акрамя таго, не будзе працаваць 23 і 24 снежня.

Пасольства Італіі будзе закрыта 25, 26, 27 і 28 снежня, а таксама 1, 3, 4 і 6 студзеня. 7 студзеня пасольства працуе ў звычайным рэжыме.

Пасольства Латвіі будзе закрыта 25, 26, 27 і 28 снежня, а таксама 1, 2, 3 і 4 студзеня. 7 студзеня ў латвійскім пасольстве — звычайны працоўны дзень.

Літоўскае пасольства будзе закрыта 25, 26, 27 і 28 снежня, а таксама 1, 3 і 4 студзеня. Акрамя таго, як патлумачылі ў пасольстве, консульская служба не будзе весці прыём наведвальнікаў 31 снежня і 2 студзеня, а 24 снежня, напярэдадні Каляд, пасольства будзе працаваць па графіку "скарочанага дня". 7 студзеня ў пасольстве Літвы — працоўны дзень.

Польскія дыпламаты адпачываюць 25, 26, 27 і 28 снежня, а таксама 1, 2, 3, 4 і 7 студзеня.

Пасольства Расійскай Федэрацыі будзе закрыта 27 і 28 снежня, 1, 3, 4, і 7 студзеня.

Пасольства ЗША будзе закрыта 25, 26, 27 і 28 снежня, а таксама 1, 3, 4 і 7 студзеня.

Пасольства Францыі не будзе працаваць 25, 27 і 28 снежня, а таксама 1, 3, 4 і 7 студзеня.

Нямецкае пасольства адпачывае 23, 24, 25, 26, 27, 28 і 31 снежня, а таксама 1, 3, 4 і 7 студзеня.

Пасольства Чэхіі працуе па падобным графіку, але ў яго на адзін выхадны больш — 2 студзеня.

Прадстаўніцтва ў Мінску Пасольства Швецыі ў Расійскай Федэрацыі будзе закрыта 24, 25, 26, 27, 28 і 31 снежня, а таксама 1, 2, 3, 4 і 6 студзеня. 7 студзеня ў шведаў — працоўны дзень.

Генеральнае консульства Эстоніі будзе закрыта з 22 снежня па 4 студзеня, а таксама 7 студзеня.

Крыху карацейшыя "канікулы" ў Пасольстве Японіі — з 27 снежня па 4 студзеня. Калядныя дні — 25, 26 снежня і 7 студзеня — выхаднымі для гэтага пасольства не з'яўляюцца. 23 снежня японская дыпламатычная місія будзе закрыта з нагоды нацыянальнага свята гэтай краіны — Дня нараджэння імператара.

Юрый ДАВІДОЎСКІ.

Старый-новый облик коллаборантов,

или Под чем предлагают подвести «жирную черту» «социально близкие»

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Такое вот последовало указание из "национально ориентированных кругов". Казалось бы, по логике, должно было бы последовать противное — на уход демократии из России белорусские власти **"должны отреагировать развитием демократии в Беларуси".** Но разве это — демократия — интересует "социально близких"? Разве для них важно, что сворачивание демократии в России — это очень плохой знак для будущего уже давно свернувшей всякую демократию Беларуси?

"Социально близкие" таким образом выдают своего рода карт-бланш нынешнему режиму: главное — подальше от России, а все остальное мы вам простим. Но если режим, устанавливающийся в России, близок давно установившемуся белорусскому авторитаризму, то почему последний должен отдаляться от России? Они же родные! Вот тут-то и проявляется неполная, скажем так, близость "социально близких" нынешнему режиму в Беларуси. Свои да не очень... Поэтому лучше их держать на отдалении.

«Жирная черта» или «жирное пятно»?

Это программное выражение-предложение — "жирная черта под прошлым" — конечно же, заимствовано нашими "социально близкими" у поляков. Это в Польше, во времена "круглого стола", объединившего часть правящей и наиболее трезво мыслящей номенклатуры с оппозицией и приведшего к смене государственного строя, установлению демократических порядков, из рядов либеральных оппозиционеров было выдвинуто предложение о "жирной черте под прошлым". Никто не хотел слепой мести, тем более крови. Но в Польше была такая мощная сила, как "Солидарность", и многим казалось, что она гарантировала справедливый расчет с прошлым, при котором тени минувшей эпохи не воскреснут. Но они воскресли. В виде смычки бывшей номенклатуры, укрывшейся под социал-демократическими, левыми знаменами и прорвавшейся к национальным богатствам, заводам, банкам, кредитам, с разложившейся, деградировавшей в борьбе за власть верхушкой "Солидарности". Расчета с коммунистическим прошлым не произошло. Отсюда нынешняя разочарованность польского общества в политике и политиках, отсюда чуть ли не ежедневно возникающие громкие коррупционные скандалы, в которых замешаны министры, депутаты сейма, общественные деятели.

Так то в Польше, где сильна память о прошлом, о традициях борьбы за национальное освобождение. В Польше, где хотя и с большим скрипом, но идут судебные процессы над бывшими палачами, затаившимися на пенсии прокурорами, генералами, чиновниками, повинными в гибели людей. В Польше, где понимают, что установление там коммунистического режима было в первую очередь связано с итогами Второй мировой войны. В Польше, где худо-бедно, но сегодня соблюдается разделение властей, есть действительно независимая пресса и далеко не всесилен президент.

А что конкретно имеют в виду мыслители из "НН", предлагая в Беларуси подвести "жирную черту под 90-ми годами"? Одобрить полный слом конституции? Избиение депутатов Верховного Совета? Похищения деятелей оппозиции? Уничтожение предпринимательства и негосударственной прессы? Абсолютную зависимость судов от власти? "Список благодеяний" может быть длинным... И все это вершилось не в какой-то довоенной, жившей под сталинской пятой, а в сегодняшней, якобы демократической Беларуси.

Редактор А.Дынько особо оговаривает это условие: *"отказ от насилия как способа достижения политических целей".* "Забывая" указать, с чьей стороны проявлялось и проявляется насилие.

Впрочем, что тут толковать, ежели у "социально близких" есть одна сокровенная мечта, во имя которой они многое готовы простить. Ее, эту мечту, вполне откровенно выразил Вацлав Заякоть на той же странице "НН", на которой напечатана статья А.Дынько: *"Вообразите, уважаемые читатели "НН", что Лукашенко вдруг заговорил по-белорусски. Многие бы из вас тогда имели бы к нему какие-то претензии?"*

В годы войны немцы одобряли открытие белорусских школ и разнообразную национальную работу. Но и плату потребовали от им, немцам, "социально близких": активное участие в уничтожении мирных жителей только за то, что они не принадлежали к "неарийской расе". И "социально близкие" достойно выполняли эту задачу. Утром отведет ребенка в белорусскую школу, а вечером другого ребенка с другим цветом глаз и волос, постреляет... Алесь Адамович показал в "Карателях", как это делается. И, как говорит спадар Заякоть, какие могут быть претензии, ежели разрешено говорить по-белорусски?

Может быть, пример не для наших времен? Не буду настаивать. Но какая-то цепочка, несомненно, тянется... Во всяком случае, никто из нынешних вполне национальных и демократических историков не объяснил еще, какую Беларусь строили те, времен войны, "социально близкие". Но это была бы Беларусь, в которой, полагаю, не только я не хотел и не смог бы жить, но и множество белорусов.

И сдается мне, что и нынешним "социально близким" абсолютно все равно, что те, кого они называют "лукашенковцами", строят на самом деле Беларусь без белорусов, без белорусской культуры, без языка. Потому что все перечисленное возможно только на фундаменте подлинной демократии. В противном случае речь может идти только о внешнем антураже, о декорациях, даже если Лукашенко заговорит по-белорусски.

Мне не раз приходилось писать о национальной ограниченности, особенно в период "перестройки" и первых лет белорусской суверенности. Иной раз думалось: та трагедия, что произошла с нашей Беларусью, за последующий десяток с лишком лет, быть может, отрезвит головы? Но вот читаю все в том же номере "НН" в статье Сергея Дубавца "Секрет Бендэ": *"К примеру, как можно критиковать антибелорусскую политику нынешних властей, издавая при этом оппозиционную газету по-русски?"* И понимаю, что для этих людей ничто не изменилось. Антироссийскость как залог строительства независимой Беларуси сохраняется в качестве ведущего курса. И нахожу новое подтверждение словам Эмиля Чорана: "Ничто так не льстит самолюбию и не способствует самоуважению, как возможность отодвинуть как можно дальше от себя причину своего ничтожества".

Единственный вопрос: как долго еще будет продолжаться в "национальных головах" этот процесс самоудовлетворения? Впрочем, если их устраивает роль "социально близких", то ради Бога! Только не следует слишком обольщаться: хозяин камеры всегда укажет суетящейся "шестерке" ее место — у параши.

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

Уэсли Кларк: Милошевич знал заранее об убийствах мусульман в Сребренице



Бывший президент Югославии Слободан Милошевич знал о планировании массовых убийств боснийских мусульман в Сребренице в 1995 году. Об этом заявил Уэсли Кларк в ходе дачи показаний по делу Милошевича в Международном суде в Гааге. В 1999 году Кларк возглавлял командование объединенных сил союзников во время военной операции в Югославии, а в настоящее время является кандидатом в президенты США от демократической партии. В 90-е годы прошлого века он неоднократно встречался с Милошевичем.

Согласно показаниям Кларка, бывший югославский лидер был хорошо осведомлен, что генерал Ратко Младич, являвшийся ближайшим помощником лидера боснийских сербов Радована Караджича, планировал бойню в Сребренице, впоследствии признанную самой кровавой в Европе со времен Второй мировой войны. Кроме того, Милошевич призывал Младича не убивать боснийских мусульман.

Ознакомившись со свидетельскими показаниями Кларка, Слободан Милошевич назвал их "вопиющей ложью". Югославский экс-президент заявил, что выполнял миротворческую миссию на Балканах.

Младший «вашингтонский снайпер» признан виновным в убийстве

Суд присяжных признал 18-летнего младшего "вашингтонского снайпера" виновным в убийстве с отягчающими обстоятельствами 47-летней Линды Франклин в октябре 2002 года. В общей сложности Джон Ли Мальво признан виновным в двух убийствах, причем одно из них приравнено к террористическому акту, и в применении огнестрельного оружия в преступных целях. Теперь осужденного ожидают либо смертная казнь, либо пожизненное тюремное заключение без права на досрочное освобождение.

